Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

# ИЗ ИСТОРИИ НАУКИ БЕЛАРУСИ

## К 25-ЛЕТИЮ ИСТОРИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА БрГУ ИМЕНИ А.С. ПУШКИНА

Сборник материалов
международной научно-практической конференции

Брест, 25–26 ноября 2016 года

В двух частях

Часть 1

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2018

УДК 001(091)(082)
ББК 72.3я431
И 32

*Рецензенты:*

заведующий кафедрой гуманитарных наук УО «Брестский государственный технический университет», кандидат исторических наук, доцент
**А.В. Мощук**

доцент кафедры историко-культурного наследия УО «Полесский государственный университет», кандидат исторических наук, доцент
**И.Э. Еленская**

*Редакционная коллегия:*

кандидат исторических наук **Е.А. Бурик**
доктор исторических наук, профессор **А.Н. Вабищевич**
кандидат исторических наук, доцент **Е.И. Пашкович**
кандидат исторических наук, доцент **Е.С. Розенблат**
доктор исторических наук, доцент **И.И. Шевчук**

И 32 **Из истории** науки Беларуси: к 25-летию исторического факультета БрГУ имени А. С. Пушкина : сб. материалов междунар. науч.-практ. конф., Брест, 25–26 нояб. 2016 г. В 2 ч. Ч. 1 / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол.: Е. А. Бурик [и др.]. – Брест : БрГУ, 2018. – 284 с.

ISBN 978-985-555-740-2 (ч. 1).
ISBN 978-985-555-739-6.

В материалах сборника исследователями Беларуси, Украины, России, Польши, Литвы рассмотрены проблемы международных отношений, межнациональной и конфессиональной политики, проблемы историографии, современные проблемы гуманитарного образования и геополитики.

Издание адресовано научным работникам, ученым, преподавателям и студентам вузов, а также всем, кто интересуется актуальными проблемами исторической науки.

**УДК 001(091)(082)**
**ББК 72.3я431**

**ISBN 978-985-555-740-2 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-555-739-6**

© УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», 2018

УДК 378(476)(091)

**А.М. ВАБІШЧЭВІЧ**
Беларусь, Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БрДУ ІМЯ А.С. ПУШКІНА: НАВУКОВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЯГО РАЗВІЦЦЯ

Свой 25-гадовы юбілей гістарычны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна сустракае калектывам высокакваліфікаваных навукова-педагагічных кадраў. Па стане на 1 верасня 2016 г., на 4 кафедрах (гісторыі Беларусі, гісторыі славянскіх народаў, усеагульнай гісторыі, паліталогіі і сацыялогіі) працавалі 33 выкладчыкі, з іх 4 доктары навук, прафесары, 23 кандыдаты навук, дацэнты. Такая ўнушальная перавага асоб з навуковымі ступенямі і вучонымі званнямі з'яўляецца сведчаннем таго, што павышэнне навуковай кваліфікацыі заўсёды было прыярытэтным напрамкам у дзейнасці факультэта і яго кафедраў. У 1991–2016 гг. выкладчыкамі гістарычнага факультэта абаронены 4 доктарскія і 17 кандыдацкіх дысертацый. Толькі на працягу апошніх 5 гадоў былі паспяхова абаронены 2 доктарскія і 3 кандыдацкія дысертацыі. А.М. Вабішчэвіч атрымаў Дыплом лаўрэата конкурсу ВАК Рэспублікі Беларусь за лепшую доктарскую дысертацыю 2011 г., яго работу Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка адзначыў як прыклад дасягненняў айчынных вучоных-гуманітарыяў [2]. У апошнія гады пад навуковым кіраўніцтвам прафесараў А.М. Вабішчэвіча, А.А. Гарбацкага, М.Э. Часноўскага, дацэнта У.В. Здановіча паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі выпускнікі аспірантуры К.У. Марозька, А.А. Бурык, Т.П. Саўчук, А.М. Борун, В.М. Мярчук. Адбываецца арганізацыйнае станаўленне навуковай школы па вывучэнні гісторыі, культуры і рэлігіі заходнебеларускіх зямель (кіраўнік – прафесар А.М. Вабішчэвіч).

Вынікі навуковых даследаванняў гістарычнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна ўжо добра вядомы на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях. Асабліва выніковымі з'яўляюцца такія напрамкі, як грамадска-палітычныя працэсы, этнакультурнае развіццё і канфесійнае жыццё Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., гісторыя канфесій у Беларусі, гістарыяграфія гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і мемарыялізацыя яе падзей у Беларусі, вывучэнне і выкладанне пытанняў Халакосту, гістарычнае краязнаўства, археалагічныя і этнаграфічныя даследаванні на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, навукова-метадычнае забеспячэнне аховы правоў чалавека, сацыялагічныя і паліталагічныя даследаванні грамадства Рэспублікі Беларусь і інш. [1, с. 46; 4, с. 213–214; 6; 8, с. 23–26].

Спецыялісты гістарычнага факультэта ўдзельнічалі ў выкананні шэрагу міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навукова-даследчыцкіх праектаў, у тым ліку ў рамках Дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь. У 2005–2015 гг. яны прымалі ўдзел у выкананні 17 навуковых тэм, якія прайшлі дзяржаўную рэгістрацыю, у тым ліку 2 – у рамках Дзяржаўных комплексных праграм, 1 – у межах сумеснага праекта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў і Расійскага гуманітарнага навуковага фонда. Былі падрыхтаваны аб'ёмістыя гісторыка-

краязнаўчыя даследаванні па цэламу шэрагу раёнаў Брэсцкай вобласці (Івацэвіцкаму, Іванаўскаму, Маларыцкаму). Праведзена велізарная праца ў галіне крыніцазнаўства. Былі падрыхтаваны і выдадзены зборнікі архіўных дакументаў па гісторыі Брэста ў 1919–1939, 1939–1941 і 1941–1945 гг. Выкладчыкі факультэта прымалі ўдзел у падрыхтоўцы зборніка дакументаў і матэрыялаў «Польша – Беларусь (1921–1953)» (Минск, 2012). У рамках абласной, рэспубліканскай праграм па адраджэнні і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, праграмы Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі дацэнт А.А. Башкоў і старшы выкладчык В.Ю. Піліповіч удзельнічалі ў археалагічных даследаваннях палаца Пуслоўскіх XIX ст. у Косаве, палаца Сапегаў у Ружанах, палацава-паркавага комплекса XVII–XVIII стст. у Воўчыне, кляштара картузаў XVII–XVIII стст. у Бярозе, фамільнай капліцы Ажэшкаў у Закозелі, Цярэспальскіх варот Брэсцкай крэпасці, сядзібы роду Дастаеўскіх XVI–XVIII стст. у Дастоеве, палацава-паркавага ансамбля Нямцэвічаў XVII–XIX стст. у Скоках і іншых помнікаў архітэктуры Брэсцкай вобласці [3]. Далёка па-за межамі Беларусі вядомы вучэбна-метадычныя выданні па правах чалавека прафесара І.І. Котляра.

Вынікі навукова-даследчыцкай працы апрабіруюцца ў выдадзеных манаграфіях, курсах лекцый, артыкулах у айчынных і замежных навуковых выданнях, дакладах на канферэнцыях у Рэспубліцы Беларусь і за мяжой, укараняюцца ў навучальным працэсе, выкарыстоўваюцца ў працы устаноў культуры, органаў дзяржаўнага кіравання. На працягу апошняга дзесяцігоддзя намаганнямі прафесарска-выкладчыцкага складу гістарычнага факультэта падрыхтавана і выдадзена 18 манаграфій, 10 вучэбных дапаможнікаў, курсаў лекцый, вучэбна-метадычных комплексаў для студэнтаў ВНУ, даведачных і дыдактычных зборнікаў [1, с. 46].

Важным напрамкам дзейнасці гістарычнага факультэта з'яўляецца арганізацыя і правядзенне навуковых канферэнцый рознага ўзроўню (міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных, універсітэцкіх). З 2003 г. сталі традыцыйнымі міжнародныя канферэнцыі «Асоба ў гісторыі: гераічнае і трагічнае». Другая канферэнцыя ў 2004 г. была прысвечана памяці аднаго з пачынальнікаў гістарычнага факультэта – прафесара У.У. Мелішкевіча, а ў 2013 г. адбылася ўжо шостая такая канферэнцыя. Сумесна з Брэсцкай епархіяй Беларускай Праваслаўнай Царквы ў 2007, 2011, 2013 гг. былі праведзены І, ІІ і ІІІ Міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі «Праваслаўе у духоўным жыцці Беларусі», у 2008 г. – Міжнародная навукова-багаслоўская канферэнцыя «Дабраверны князь Канстанцін (Васілій) Астрожскі – славуты асветнік і абаронца праваслаўя» (да 400-годдзя памяці князя К. Астрожскага). Гэтыя навуковыя форумы, у якіх прымалі удзел аўтарытэтныя вучоныя Беларусі і замежных краін, атрымалі станоўчыя водгукі навуковай грамадскасці [7, с. 218]. Падставай для далейшага супрацоўніцтва з Брэсцкай епархіяй з'яўляюцца Праграма супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой на 2015–2020 гг. і Праграма супрацоўніцтва Брэсцкага аблвыканкама з Брэсцкай і Пінскай епархіямі Беларускай Праваслаўнай Царквы на 2016–2020 гг.

Сярод найбольш значных міжнародных канферэнцый апошняга дзесяцігоддзя трэба адзначыць таксама наступныя: 2005 г. – Міжнародная навуковая канферэнцыя «Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй»; 2006 г. – Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 65-й гадавіне пачатку Вялікай Айчыннай вайны «1941 год: трагедыя, гераізм, памяць»; 2010 г. – X Міжнародная канферэнцыя школьнікаў, студэнтаў і выкладчыкаў «Халакост: памяць і папярэджанне», прысвечаная памяці дацэнта У.І. Нікіценкава; 2011 г. – Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Геапалітычныя трансфармацыі ва Усходняй Еўропе паміж дзвума сусветнымі войнамі. Да 90-годдзя падпісання Рыжскага мірнага дагавора»; 2012 г. – Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Нацысцкая палітыка генацыду на акупаваных тэрыторыях СССР».

Акрамя таго, быў праведзены цэлы шэраг навуковых мерапрыемстваў рэспубліканскага і рэгіянальнага ўзроўняў: Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 55-годдзю ваенных вучэнняў на Тоцкім палігоне (2009 г.), Рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Гісторыя і традыцыі беларускай навукі (да 90-годдзя Інстытута беларускай культуры)» (2012 г.), II і III Рэспубліканскія студэнцкія навукова-практычныя канферэнцыі «Фальклор, гісторыя і літаратура беларусаў у кантэксце культурнай спадчыны славян» (2013, 2015 гг.), «Беларусь і славянскі свет у інтэлектуальным кантэксце часу» (штогод з 2014 г.) і інш. Сумесна з Прадстаўніцтвам ААН у Рэспубліцы Беларусь з удзелам устаноў навукі, адукацыі, грамадскіх структур з 2009 г. рэгулярна праводзіцца Міжвузаўскі (рэспубліканскі) навукова-метадалагічны семінар выкладчыкаў правоў чалавека і грамадскай супольнасці [8, с. 25–26; 1, с. 47].

На гістарычным факультэце створаны ўмовы, якія дазваляюць раскрыць навукова-даследчыцкі патэнцыял студэнтаў і магістрантаў, рэалізаваць іх здольнасці да самастойнай навуковай працы. Асноўнымі формамі навукова-даследчыцкай працы з імі з'яўляюцца навукова-даследчыя групы, індывідуальная праца. Важную ролю ў актывізацыі навуковай працы іграюць валанцёрскія студэнцкія атрады для правядзення археалагічных даследаванняў. На гістарычным факультэце дзейнічае студэнцкае навуковае таварыства, асобныя студэнцкія навукова-даследчыцкія групы па вывучэнні розных праблем айчыннай і сусветнай гісторыі, міжкафедральная студэнцкая навукова-даследчыцкая лабараторыя «Вусная гісторыя». Праводзіцца праца па стварэнні архіўнай базы вуснай гісторыі жыхароў Брэсцкай вобласці. Вынікі даследчыцкай працы студэнтаў, магістрантаў прадстаўляюцца ў дакладах на канферэнцыях рознага ўзроўню ў краіне і за мяжой, у навуковым друку.

Кафедрамі гістарычнага факультэта ажыццяўляецца плённае супрацоўніцтва з Інстытутам славяназнаўства РАН, Расійскім навукова-асветніцкім цэнтрам «Халакост», філіялам Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта ў г. Дамадзедава Маскоўскай вобласці, Беластоцкім універсітэтам і іншымі замежнымі навуковымі цэнтрамі, універсітэтамі. Сумесна з польскімі даследчыкамі А.М. Вабішчэвіч прымаў удзел у падрыхтоўцы 2-х даведнікаў «Polska-Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne» («Польшча-Беларусь.

Агульная гістарычная спадчына»), якія былі выдадзены ў Варшаве ў 2013 і 2015 гг. Яны ўтрымліваюць упершыню распрацаваную базу пошуку дакументальных матэрыялаў па гісторыі заходнебеларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы (1918–1939 гг.), што захоўваюцца ў архівах Брэста, Гродна, Маладзечна і Мінска [7, с. 218].

У цэлым гістарычны факультэт ужо мае пэўныя дасягненні ў навуковай дзейнасці, якія добра вядомы ў краіне і за мяжой. На факультэце ажыццяўляецца планамерная падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай навуковай кваліфікацыі. Наяўнасць высокакваліфікаваных спецыялістаў, выніковасць іх навуковай працы стварае добрую падставу для выканання на сучасным этапе і ў бліжэйшай перспектыве Дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, навуковых праектаў, іх экспертызы па цэлым шэрагу перспектыўных і запатрабаваных напрамкаў: гісторыя і сучасны стан традыцыйных канфесій і неакультаў на тэрыторыі Брэсцкай вобласці; гісторыя і культура раёнаў, населеных пунктаў, прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў Брэсцкай вобласці; гісторыка-краязнаўчыя пошукі; гісторыка-антрапалагічныя, археалагічныя даследаванні; мемарыялізацыя падзей Першай сусветнай і Другой сусветнай войн; выяўленне, навуковая апрацоўка, выданне дакументаў і матэрыялаў па гісторыі, культуры, рэлігіі Брэсцкай вобласці; прыгранічнае супрацоўніцтва Беларусі з Польшчай, Украінай і інш. Мяркуем, што лепшыя традыцыі гістарычнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна будуць толькі ўмацоўвацца, а вынікі навукова-даследчыцкай працы папаўняцца новымі здзяйсненнямі.


1. Ад настаўніцкага інстытута да ўніверсітэта: этапы станаўлення БрДУ імя А. С. Пушкіна / У. В. Здановіч [і інш.] ; рэдкал. : Г. М. Сендзер (гал. рэд.) [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2015. – 77 с.

2. Афіцыйны інтэрнэт-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/7-fevralja-glava-gosudarstva-vruchil-diplomy-doktora-nauk-i-attestaty-professora. – Дата доступу: 20.11.2016.

3. Башкоў, А. А. Вынікі ўдзелу спецыялістаў і студэнтаў гістарычнага факультэта БрДУ імя А. С. Пушкіна ў археалагічных даследаваннях у ходзе рэстаўрацыі помнікаў Берасцейшчыны ў пачатку 2000-х гг. / А. А. Башкоў // Вучон. зап. Брэсц. ун-та : зб. навук. прац. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2015. – Вып. 10, ч. 1 : Гуманітар. і грамад. навукі. – С. 243–247.

4. Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна. Старонкі гісторыі : 60-годдзю БрДУ прысвеч. / пад агул. рэд. М. Э. Часноўскага. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2005. – 250 с.

5. Вабішчэвіч, А. М. Гістарычны факультэт Брэсцкага ўніверсітэта ў пачатку XX стагоддзя: асноўныя напрамкі дзейнасці, вынікі працы і перспектывы развіцця / А. М. Вабішчэвіч // Личность в истории: героическое и трагическое : сб. материалов Пятой междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 20-летию ист. фак., Брест, 23–24 нояб. 2011 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол.: М. Э. Чесновский (гл. ред.) [и др.]. – Брест : БрГУ, 2012. – С. 22–30.

6. Вабішчэвіч, А. М. Гісторыя гістарычнага факультэта [Электронны рэсурс] / А. М. Вабішчэвіч, Н. П. Галімава. – Рэжым доступу: http://70let.brsu.by/gistoryya-gistarychnaga-fakulteta. – Дата доступу: 16.10.2016.

7. Вабішчэвіч, А. М. Кафедра гісторыі славянскіх народаў БрДУ імя А. С. Пушкіна: стан, вынікі, перспектывы навукова-даследчыцкай працы / А. М. Вабішчэвіч // Вучон. зап. Брэсц. ун-та : зб. навук. прац. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2015. – Вып. 10, ч. 1 : Гуманітар. і грамад. навукі. – С. 215–220.
8. Вабішчэвіч, А. М. Навуковы патэнцыял і перспектывы развіцця гістарычнай адукацыі / А. М. Вабішчэвіч, Н. П. Галімава // Вып. шк. – 2015. – № 4. – С. 23–27.

УДК 378(035)
**Л.П. НИКИТЕНКОВА, А.Э. ХОМИЧ**
Беларусь, Брест, БрГУ имени А.С. Пушкина

## НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКАЯ РАБОТА ПРЕПОДАВАТЕЛЕЙ И СТУДЕНТОВ БГПИ имени А.С. ПУШКИНА В 70-е гг. XX в.

В настоящее время европейская образовательная система характеризуется двумя тенденциями – глобализацией и регионализацией, которые «в одно и то же время являются антиподами и взаимно дополняют друг друга» [1, с. 10]. С одной стороны, предоставляемые образовательные услуги должны быть глобальными, т.е. соответствовать потребностям времени, с другой стороны, есть «необходимость в объединении региональных учреждений образования с целью совместного противостояния конкуренции» [1, с. 10].

Сегодня «главная задача учреждений высшего образования – подготовка специалистов, способных на основе новейших достижений науки и техники, глубоких фундаментальных знаний генерировать новые идеи, создавать и внедрять инновационные разработки в производство и социальную сферу, обеспечивать перспективное развитие высокотехнологичных отраслей экономики. Этим определяется роль науки в университетах…» [2, с. 5].

Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина ведет активную работу по развитию научно-исследовательской и инновационной деятельности и имеет хорошие показатели в этом направлении. Университет был образован в 1995 г. на базе государственного педагогического института, который берет свое начало с учительского института, открытого в 1945 г.

В 1970-е гг. вуз имел два учебных корпуса: главный учебный корпус по улице Советской, 8 и корпус № 2 по улице К. Маркса, 60. В 1976/77 учебном году начал работать спортивный комплекс с двумя плавательными бассейнами [3, л. 4]. Но с первых дней его работы в нем стали планировать проведение спортивных мероприятий различного уровня (от всесоюзных до городских включительно). А это срывало учебные занятия открывшегося в 1969/70 учебном году факультета физического воспитания. К строительству нового учебного корпуса, который сегодня расположен по бульвару Космонавтов, 21, приступили только в 1979/80 учебном году. В 1970-е гг. наблюдалась нехватка учебных площадей, отставала материально-техническая база от потребностей института. Тем не менее, учреждение вело активную работу по развитию научно-исследовательской деятельности преподавателей и студентов, создавал условия